# КОНКУРС БУКТРЭЙЛЕРАЎ «Да духоўнасці праз кнігу»

Падрыхтавала Пашкевіч І.Т.

бібліятэкар ДУА «Камайская сярэдняя школа Пастаўскага раёна» Віцебскай вобласці

# Раман-дыялогія
# для старэйшага школьнага узросту

Галоўны твор жыцця пісьменніцы, якому аддадзена 15 творчых гадоў.

Гісторыка-біяграфічныя дыялогі створаны на аснове жыцця і творчасці славутай пісьменніцы і сястры міласэрнасці Алаізы Пашкевіч (Цёткі).



Постаць Алаізы Пашкевіч— цэнтральны вобраз твор- часці В.Коўтун. У сваім творы «Крыж міласэрнасці» Валянціна Коўтун паказала пры якіх абставінах, з якім натхненнем і ў які перыяд жыцця А.Пашкевіч (Цёткі) пісаўся той або іншы верш.



На старонках вострасюжэтнай кнігі ажывае шмат іншых знакамітых людзей пераломнай эпохі: пісьменнікі--Я.Купала, Э.Ажэшка, І.Франко, К. Каганец, дзяржаўныя дзеячы—Мікалай II, граф Вітэ, мітрапаліт Шаптыцкі.

На старонках адлюстраваны рэвалюцыйныя падзеі 1905 года.


















Асабліва трапяткой мовай напісаны старонкі пра каханне.

...Як жа зразумець дзе каханне, дзе падман ? З кім звядзе лёс Алаізу ? ...Можа з тым сябрам з дзяцінства—Андрэем Гмыраком? А можа з Костусем Каранцом?..



«...Неба не было раўнадушным да пакут гэтай жаночай душы—Алаізін твар здаваўся знутры прасветленым, праз хваляванне прабівалася тое святло, якога ён заўсёды шукаў у людзях, шукаў фарбамі, калі маляваў лікі святых пакутнікаў. Цяпер ён ужо ведаў—ягоным абразам заўсёды не хапала таямнічай прасветленасці. ...А можа, і Евангелле ён чытаў, як той гогалеўскі паштмайстар чужыя лісты, шукаючы толькі доказаў гра-хоўнасці бліжняга свайго...»



«Ах, мілая Алаіза, як мала каля нас праўдзівых людзей, так мала верацць у бессмяротнасць душы, у яе сапраўдную ўнутраную цягу да Боскай мыслі, мэты—вось рэлігія… Прыйсці да Бога можна толькі па адной дарозе! Праўды і міласэрнасці»

Э.Ажэшка



«…Пане адвакат, няхай кожны памірае за ўласнае беззаконне і адказвае толькі за сябе, але ж…так атрымліваецца, што бацькі елі кіслы вінаград, а аскоміна—на зубах у дзяцей!»

«…Прыйдзе час, і многія з тых, хто ўжо спіць у зямлі, прабудзяцца ва ўнуках і праўнуках—адны для вечнага шчасця, другія—на вечнае ганьбаванне і асмяянне.»

Думкі пісьменніцы накіраваны на вырашэнне вострых душэўных пытанняў. На многія пытанні можна знайсці адказы, задумацца аб чысціні сваёй душы…